Колеры Адвэнту

Аўтар: С. Зоя Дамброўская ISSM
24.11.2019 00:00



Набліжаецца цудоўны час – Адвэнт.

У кагосьці ён атаясамліваецца са ззяннем гірлянд у крамах і на вуліцах.

Хтосьці ўспрымае гэты перыяд у адценнях цёмных раніц і далікатнага святла свечак падчас раратніх св. Імшаў альбо бачыць драўляныя яслі і залатое сена добрых учынкаў, сабраных для Дзіцятка Езус.

Для некаторых гэта цяжкі час перад першымі Святамі без самых блізкіх, якія адышлі ў вечнасць…

А з чым у Вас атаясамліваецца Адвэнт? У маім уяўленні Адвэнт прыгадвае прыгожы аздобны ліхтарык, які вісіць на цаглянай сцяне і адкідвае яснае цёплае святло. Нядаўна я ўпершыню ў жыцці малявала акварэллю, і гэты новы досвед захапіў мяне да глыбіні душы. Паспрабую намаляваць сваю карціну пад назвай “Адвэнт”.

†

Бяру ў рукі чысты аркуш паперы. Яго некранутая бель сімвалізуе цішыню, без якой не ўдасца адпаведным чынам перажыць падрыхтоўку да прыходу Збаўцы. Яна вельмі патрэбная, таму што вакол нас і ў нас саміх шмат шуму і мітусні. Цішыня дапамагае заўважыць, што маем жыццё ў сабе – унутранае жыццё. Чым і як часта кормім сваю душу? Нярэдка так актыўна клапоцімся аб здаровым харчаванні, дыетах... А ці дбаем аб спажытку духоўным?

Ці насычаем душу малітвай, размовай з Усемагутным, Божым словам, сакрамантамі?

Цішыня неабходна, каб пазнаць сябе, а затым даваць сябе іншым. Мы штодзённа маем важныя тэмы для абмеркавання, справы для вырашэння, музыку для праслухвання, тэлефоны для размоў і смс…

Усё гэта заглушае свядомасць. Патрабуем цішыні, каб сустрэцца з Богам. Нябесны Айцец нястомна нас чакае, звяртаецца да нас, але маем занадта шмат усяго ў галаве, занадта шмат шуму навокал, каб здолець Яго пачуць.

Колеры Адвэнту

Аўтар: С. Зоя Дамброўская ISSM
24.11.2019 00:00

